Улічыўшы вопыт выбарчай кампаніі ў I Дзяржаўную думу правыя сілы ў заходніх губернях, пры актыўнай падтрымцы мясцовай адміністрацыі і паліцыі, значна актывізавалі сваю дзейнасць у далейшым. У выніку, дэпутаты-палякі ад г. Мінска і губерні ўцэлым не змаглі прабіцца ў склад дэпутатаў Думы II, III і IV скліканняў. Яны былі забалатаваны крайне-правымі, якія заключылі блокі з сялянскімі і гарадскімі выбаршчыкамі і рабілі стаўку на правастаронніх землеўласнікаў.

*Літаратура*

1. Забаўскі М. М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906 – 1917 гг.). Мн., 1999. 212 с.
2. Смалянчук А., Лядніцкі Л. Р. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 4. Мн., 1997.С. 422.

***А. Вялікі,***
***(Мінск)***

# ПОЛЬСКІЯ ПАМЕШЧЫКІ: ХРОНІКА ЗНІШЧЭННЯ. 1917–1930 гг.

Адным з асноўных дакрэтаў савецкай улады, прынятых пасля кастрычніцкага перавароту 1917 г., з'яўляўся дакрэт аб Зямлі. У адпаведнасці з ім памешчыцкая, манастырская зямля пераходзіла ва ўласнасць дзяржавы і перадавалася сялянству, калектыўным гаспадаркам, ведамствам ды ўстановам. Адмена прыватнай уласнасці на зямлю азначала, разам з тым, ліквідацыю памешчыкаў як «класа», які варожа ставіўся да савецай улады. У айчыннай гісторыі больш вядома аб працэсе ліквідацыі кулака як класа, што ж датычыць ліквідацыі памешчыка як «класа», то ў беларускай гістарыяграфіі ёсць значны прабел па гэтай праблеме. У сувязі з гэтым цікавасць уяўляе пытанне як праходзіла «ліквідацыя» памешчыкаў як «класа». Мы свядома ўзялі ў коскі слова «клас», бо, на наш погляд, гэта была сацыяльная група грамадства, а не клас, якая займала своеасаблівае месца ў культурным, палітычным, эканамічным жыцці беларускага грамадства.

Бальшавіка, разглядаючы памешчыкаў як «варожы элемент» тым не менш прадаставілі тым з іх, хто лаяльна ставіўся да новай улады магчымасць займацца гаспадарчай дзейнасцю, аднак без прымянення наёмнай сілы. У 1918 г. савецкая ўлада заканадаўча «аформіла» свас ўзаемаадносіны з гэтай групай насельніцтва. 1 кастрычніка 1918 г. Наркамзем РСФСР падрыхтаваў і даслаў у мясцовыя зямельныя аддзелы «Інструкцыю аб былых зямляўладальніках і аб іх маёмасці», (яна мела юрыдычную сілу і на тэрыторыі Беларусі), у якой тлумачылася, што «высяляемыя з сваіх маёнткаў непрацоўныя асобы (меліся на ўвазе памешчыкі і іх блізкія) маюць права пасялення ў любым месцы тэрыторым Рэспублікі разам з іншымі грамадзянамі».[1] Акупацыя тэрыторыі Беларусі нямецкімі войскамі ў час Першай сусветнай, грамадзянскай, расейска-польскай вайнаў, безуладзя і неразбярыхі, што панавалі ў той час, прывялі да таго, што колішняя эканамічная магутнасць, узорнасць памешчыцкіх гаспадарак прышла ў заняпад. Яскравым сведчаннем гэтага з'яўляецца стан маёнтка Ясарпаўка, які знаходзіўся ва Ігуменскім уездзе. Вось што паведамляў ва Ігуменскі ўездны выканаўчы камітэт дырэктар саўгаса Ясарпаўка, які быў створаны на месцы былога маёнтка: «Да вайны гаспадарка Ясарпаўка была адной з найбольш выдатных гаспадарак нашага краю. З пачаткам вайны яна пачала прыходзіць у заняпад. У цяперашні час гаспадарка знаходзіцца ў глыбокім крызісе – палі пустыя, большая частка пабудоў згарэла, платы акруг маёнтка зруйнаваныя, інвентар згарэў. Адзначаю, што ад некалі прыкладнай гаспадаркі засталіся адны ўспаміны».[2]

Ва Ігуменскім уездзе знаходзіліся і іншыя памешчыцкія маёнткі. Так, у студзені 1919 г. камісія, створаная з прадстаўнікоў мясцовых уладаў уезда правяла нацыяналізацыю ўсёй маёмасці былога памешчыка Льва Львовіча Ваньковіча, маёнтак якога знаходзіўся непадалёку ад Смілавіч. Л.Л.Ваньковічу належала 2789 дзесяцін зямлі, з якіх уласна пад маёнткам, садам, паркам знаходзілася прыблізна 50 дз., лесам адпаведна – 1042 дз., пахаццю – 650 дз. Яму таксама належыў вінакураны

[1] Немаков Н. К вопросу о землепользовании бывших помещиков в первое десятилетие советской власти // Вестник Московского университета. - Серия 9: История. - № 2.- 1961.- С.21

[2] НАРБ, ф. 48, воп.1, спр.107, арк.16.

і масларобчы заводы ў Смілавічах. Агульная каштоўнасць уласнасці Л. Л. Ваньковіча, нават з улікам рабаванняў і разбурэнняў, склала ў тагачасных коштах 1 млн. 426 тыс. рублёў.[1]

З усталяваннем міру і спакою ў Беларусі частка памешчыкаў вярнулася ў свае маёнткі і паспрабавала аднавіць гаспадарчую дзейнасць. Але гэты факт не мог застацца па-за ўвагай бальшавіцкай улады. У 1924–1930 гг. у СССР і, зразумела ў БССР, распачынаецца энергічная кампанія па вынішчэнню памешчыкаў.

Пачатак вынішчэнню памешчыкаў палажыла пастанова УЦВК і СНК СССР ад 25 красавіка 1925 г. «Аб лішэнні былых памешчыкаў права на землякарыстанне і пражыванне ў належачых ім да Кастрычніцкай рэвалюцыі гаспадарках».[2] У ёй падкрэслівалася, што большасць памешчыкаў варожа ставіцца да савецкай улады, эксплуатуе мясцовае насельніцтва і г.д. Да таго ж, ўсім былым памешчыкам забаранялася права на землякарыстанне і пражыванне ў гаспадарках, якія ім належалі да выдання Дакрэта аб Зямлі ад 26 кастрычніка 1917 г. Высяляемыя са сваіх маёнткаў гаспадары павінны былі здаць у добрым стане канфіскуемыя пабудовы, сельскагаспадарчы інвентар ды іншую маёмасць. Усім памешчыкам давалася права на атрыманне зямлі ў межах працоўнай нормы з каланізацыйна-перасяленчаскага фонду ў тых губернях, у якіх яны яе не мелі.

Тутэйшыя бальшавікі больш жорстка і непрыязна ставіліся да памешчыкаў, чым маскоўскія «таварышы» і нават апярэдзілі апошніх. Так, 12 снежня 1924 г., ЦК КП(б)Б самастойна ініцыяваў пытанне аб высяленні памешчыкаў і стварыў камісію пры прэзідыуме ЦКК КП(б)Б, у якую ўвайшлі адказныя партыйныя работнікі. Ім даручалася распрацаваць «мерапрыемствы», звязаныя з высяленнем памешчыкаў. Камісія аператыўна і энэргічна ўзялася за працу. Напачатку студзеня 1925 г. яна падрыхтавала і накіравала ў бюро ЦК кампартыі Беларусі пастанову аб высяленні былых памешчыкаў, якая была зацверджана бюро ЦК КП(б)Б 8 студзеня 1925 г. У ёй, у прыватнасці, адзначалася, што «высяленню належаць усе былыя памешчыкі з гаспадарак, якія належалі ім да выдання Дакрэта аб Зямлі і якія знаходзіліся ў сучасны момант поўнасцю альбо часткова ў іх фактычным карыстанні. Пры

[1] НАРБ, ф.48. воп.1, спр.107, арк.1

[2] Немаков Н. … С.23

чым пад памешчыкамі меліся на ўвазе не толькі прыватныя землякарыстальнікі дваранскага саслоўя, але і ўвогуле буйныя ўласнікі, незалежна ад іх саслоўя, калі яны жылі на непрацоўныя даходы».

Аднак справа толькі высяленнем далёка не скончылася. ЦК КП(б)Б палічыў неабходным «вычысціць» ад былых памешчыкаў усе ўстановы, дзе яны маглі працаваць. Ва ўзгаданай пастанове падкрэслівалася неабходнасць: «ачысціць ад былых памешчыкаў увесь адміністрацыйны апарат органаў Наркамзема, ўключаючы саўгасы, племгасы, вопытныя палі, конезаводы, аграпункты і г.д., дазваляя прысутнасці былых памешчыкаў, сапраўдных спецыялістаў у той ці іншай галіне сельскай гаспадаркі на адміністрацыйных пасадах толькі ў парадку выключэння, кожны раз узгадняя гэта рэшэнне ў ЦК. Прычым ачыстцы належыць не толькі адміністрацыйны апарата Наркамзема, а таксама іншых арганізацый, якія маюць дачыненне з былымі памешчыкамі».

Напачатку красавіка 1925 г. ЦК КП(б)Б адтрымаў пастанову Усесаюзнай Цэнтральнай Выканаўчай Камісіі (УЦВК) і СНК СССР, якая тычылася парадку высялення памешчыкаў і адразу ж 9 красавіка адбылося закрытае пасяджэнне бюро ЦК КП(б)Б, на якім была разгледжана гэтая пастанова. Бюро ЦК, як гэта не дзіўна, даволі жорстка раскрытыкавала рашэнне саюзнага ўрада і зазначыў, што «пастаноўка пытання ў тэлеграме УЦВК СССР аб высяленні памешчыкаў у адносінах да БССР зусім не вырашае пытання, а з'яўляецца толькі фармальнай адпіскай». Бюро аднагалосна рашыла «паскорыць і ўзмацніць кампанію высялення, даручыўшы агітацыйна-прапагандысцкаму аддзелу ЦК прыняць неабходныя захады па ўзмацненню палітычнага асвятлення гэтай кампаніі».[1] Для кіраўніцтва працай па высяленню была створана цэнтральная камісія ў складзе: наркама земляробства В. Прышчэпава, старшыні Дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення (ДПУ) І. Мядзведзя, і наркама юстыцыі М. Сегаля. У адпаведнасці з рашэннямі партыйнага кіраўніцтва аналагічныя камісіі былі створаны ў кожнай акрузе БССР. Бюро ЦК таксама падкрэсліла неабходнасць у тэрміновым парадку распачаць высялення памешчыкаў з пагранічнай паласы, і даручыла правядзенне гэтай аперацыі органам ДПУ.

[1] НАРБ, ф.4, воп.3, спр.6, л.113.



Памешчыкі, у адпаведнасці з пастановай, павінны былі высяляцца на землі каланізацыйнага фонду, які выдзяляўся Беларусі ў Сібіры, на Далёкім Усходзе і іншых аддалёных кутках Савецкага Саюзу. Усе высяляемыя дзяліліся на тры катэгорыі: памешчыкаў, якія трапілі ў першую катэгорыю, павінны былі высяліць да першага красавіка 1925 г., тых, хто трапіў ў другую – да першага верасня гэтага ж году і апошніх павінны былі высяліць да 1 студзеня 1926 г.

Да першай катэгорыі адносіліся ўсе памешчыкі, што вялі гаспадарку, альбо пражывалі ў сваіх маёнтках, якія знаходзіліся ў пагранічнай паласе, а таксама ўсе памешчыкі, якія мелі родзічаў за мяжой. Да гэтай жа катэгорыі адносіліся і памешчыкі, якія прымалі ўдзел у барацьбе з савецкай уладай.

Да другой катэгорыі адносіліся памешчыкі, што пражывалі ў сваіх маёнтках і вялі гаспадарку, а таксама тыя, хто пражываў у маёнтках-музеях, якія знаходзіліся пад аховай дзяржавы і ўяўлялі сабой каштоўнасць як гістарычныя і архітэктурныя помнікі. І да трэцяй катэгорыі адносілі ўсіх астатніх, якія вялі гаспадарку як аднаасобнікі.[1]

Цэнтральная камісія прыступіла да працы 25 красавіка 1925 г. і яна ж вызначыла агульную колькасць памешчыкаў, што падлягалі высылцы. Усяго па Беларусі было ўлічана 1096 памешчыцкіх сем'яў, а высылцы падлягала 738.[2] Аб колькасці высяляемых памешчыкаў па катэгорыях і нацыянальнасці дае ўяўленне наступная табліца (табл. 1)[3]

*Таблица 1*

| Усяго | Высяляемыя па першай катэгорыі | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 330 | рускія | палякі | латышы | беларусы | іншыя |
| | 56 | 50 | 5 | 8 | 2 |
| | Высяляемыя па другой катэгорыі | | | | |
| 215 | 25 | 23 | 4 | 2 | 4 |
| | Высяляемыя па трэцяй катэгорыі | | | | |
| 193 | 7 | 18 | 3 | 4 | 4 |

[1] там сама, л.140
[2] там сама, л.111
[3] там сама, л.118

Па акругах гэтыя лічбы выглядалі наступным чынам (табл. 2)[1]:

*Таблица 2*

| Акруга | Належыць высылцы | Па першай катэгорыі | Па другой катэгорыі | Па трэцяй катэгорыі |
|---|---|---|---|---|
| Мінская | 29 | 8 | 9 | 12 |
| Барысаўская | 52 | – | – | – |
| Бабруйская | 48 | 10 | 28 | 10 |
| Слуцкая | 20 | 10 | 8 | 2 |
| Мазырская | 36 | 19 | 9 | 8 |
| Магілеўская | 101 | 101 | - | - |
| Калінінская | 144 | 6 | 40 | 98 |
| Віцебская | 108 | 21 | 40 | 47 |
| Аршанская | 69 | 33 | 27 | 9 |
| Полацкая | 131 | 100 | 31 | – |
| Усяго | 738 | 308 | 192 | 186 |

Як вынікае з табліцы 1, найбольшая колькасць памешчыкаў належала да польскай нацыянальнасці.

Як толькі акруговыя камісія распачалі працу і вызначылі колькасці высылаемых у цэнтральную камісію пачалі паступаць шматлікія скаргі, з якіх вынікае, што ў акругах дастаткова фармальна падыйшлі да складання спісаў і падрыхтоўкі матэрыялаў на высяляемых. Так, вельмі часта ў спісы ўносіліся асобы, якія не падлягалі высяленню. Меліся выпадкі, калі пастанова аб высылцы прымянялася да тых асобаў, якія не мелі нічога агульнага з памешчыкамі. Па ўсёй бачнасці, матывамі ў такіх выпадках з'яўлялася жаданне мясцовых уладаў пазбавіцца ад пэўнага кола грамадзян. Пры вызначэнні лёсу таго ці іншага памешчыка камісія перш за ўсё зыходзіла з памераў зямлі, якая знаходзілася ў яго асабістым карыстанні, а таксама колькасці наёмных работнікаў. Польскія памешчыкі да таго ж абвінавачваліся ў тым, што яны маюць родных за мяжой, г.зн. у Польшчы. Так, на адным з паседжанняў польбюро пры ЦК КП(б)Б (чэрвень 1925 г.) падкрэслівалася, што «адзначаецца неразуменне ўмоў Беларусі, у прыватнасці польскае насельніцтва

[1] там сама, л.174

абвінавачваецца ў тым, што маюць родных у Польшчы. Праяўляецца нацыяналістычны ўхіл. Высяляецца не як памешчык, а "як паляк". Звяртаем увагу на неразуменне ранейшага саслоўнага стану польскага насельніцтва. Змешваецца паняцце шляхціч-земляроб з дваранінам і памешчыкам».[1]

Значны адбітак на працу камісіі аказвала тэрміновасць разгляду спраў. Так, цэнтральная камісія распачала працу са значным спазненнем (25 красавіка 1925 г.), а ў адпаведнасці з рашэннем саюзных органаў высылка па першай катэгорыі павінна была скончыцца да першага красавіка гэтага году. Таму яе праца насіла ліхаманкавы характар. Пасяджэнні адбываліся па некалькі дзён запар, прычым кожны дзень разглядалася па 40–50 спраў. Зразумела, што такая паспешнасць прыводзіла да блытаніны, неаб'ектыўнасці, перадузятасці пры разглядзе спраў. Гэта яскрава праявілася пры разглядзе справы сям'і Краеўскіх. Па дакрэту ад 21 лютага 1925 г. яны павінны былі быць выселены. Аднак 4 чэрвеня 1925 г. іх зварот разглядаўся на бюро ЦК КП(б)Б, якое прыйшло да высновы, што "грамадзянне Краеўскія – Марыя, Яўгенія і Юлія (Мінская акруга, Койданаўскі раён, засценак Пажэшына) – высыльцы не належаць. Пастанову цэнтральнай камісіі ад 23 красавіка 1925 г. № 7 неабходна перагледзець». Ім пакінулі 12 дзесяцін зямлі і дазволілі застацца ў засценку.[2]

Што ж датычыць польскіх памешчыкаў, то яны адзначалі, што іх высяляюць з-за таго, што "яны палякі".[3] У час першай высяленчай акцыі па-за межы рэспублікі было выслана 58 польскіх памешчыкаў: з іх па першай катэгорыі – 37. па другой – 21. Для параўнання: рускіх памешчыкаў па першай катэгорыі было выслана 68, беларускіх – 7, латышскіх – 6. Па другой катэгорыі: рускіх памешчыкаў выслана 26, беларускіх – 3, латышскіх – 4.[4]

Адзначым, што большасць польскіх памешчыкаў з'яўляліся дробнапамеснымі. Так, выселеная па першай катэгорыі памешчыца Шаблоўская Яніна Карлаўна (Заслаўскі раён) да рэвалюцыі мела

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.11, спр.53, арк.53.

[2] там сама, арк. 62.

[3] НАРБ, ф.15, воп.4, спр.174, арк.144.

[4] там сама, арк. 144.

80 дзесяцін зямлі. Пасля высылкі яе маёнтак быў нацыяналізаваны.[1]

Праца як цэнтральнай, так і акруговых камісій паказала, што выканаць графік высылкі не атрымоўваецца. Гэта было звязана з тым, што высылаемыя падавалі скаргі, якія прыходзілася разглядаць даволі працяглы час. У сувязі з гэтым, цэнтральная камісія хадайнічала перад ЦВК БССР аб прадоўжанні тэрміну працы па высяленню. Хадайніцтва было задаволена і праца камісіі была прадоўжана да 15 красавіка 1926 г.

5 лютага 1927 г. у прэзідыўме Цэнтральнай Выканаўчай Камісіі (ЦВК) БССР быў заслуханы даклад цэнтральнай камісіі аб праведзенай працы. У выніку яго абмеркавання было прапанавана працягнуць гэтую працу і абагуліць яе вынікі да 10 сакавіка 1927 г.

Як і ў першую, так і ў другую высяленчую акцыю польскія памешчыкі іспытвалі больш пільную "ўвагу" ў параўнанні з іншымі. Так, на паседжанні цэнтральнай камісіі па высяленню (вясна 1927 г.) сакратар польбюро пры ЦК КП(б)Б Пшаздзецкая, правяраючы работу па высяленню памешчыкаў па 1-й катэгорыі адзначала: «Цэнтральная і акруговыя камісіі ўзялі надта жорсткую лінію ў высяленні памешчыкаў і складваецца ўражанне праследу і ганення палякаў».[2] Аднак яе высновы прынцыпова не паўплывалі і не маглі паўплываць на ход высялення. Кампанія па высяленню працягвалася.

Такім чынам, работа камісіі па высяленню памешчыкаў замест запланаванага тэрміну да 1 студзеня 1926 г. зацягнулася аж да вясны 1927 г. Апошняя яе пасяджэнне адбылося 18 чэрвеня 1927 г. На ім была падсумаваная праца за ўвесь тэрмін і адзначана, што з ліку вызначаных да высялення 1096 памешчыкаў было высялена толькі 299 сем'яў, што склала 20,8 %. Уяўленне аб агульнай кольскасці памешчыкаў, якіх выслалі па-за межы і пакінулі на жыхарства ў БССР дае табліца 3.

Права жыхарства ў БССР атрымалі тыя памешчыкі, якія па сваёй старасці ці нямогласці не маглі быць выселеныя і астаўленне якіх не ўяўляла сабой ніякай пагрозы для існуючага рэжыма. З высяленых па-за межы Беларусі сямей толькі нязначная частка (10-

[1] Там сама, арк. 213.
[2] НАРБ, ф.4, воп.11, спр.53, арк.105.



12 %) прасялілася на землі каланізацыйнага фонду ў Сібір, на Далёкі Усход. Большая частка пераехала на сталае месца жыхарства ў Расію ды на Украіну. Так атрымалася таму, што ў адпаведнасці з інструкцыяй ЦВК БССР ад 17 красавіка 1925 г. памешчыкі мелі права сяліцца па-за межамі БССР дзе яны пажадаюць, за выключэннем тых мясцін, якія былі пазначаны ў інструкцыі. Таму, большасць з іх не пажадала ад'язджаць далёка ад родных мясцін і сялілася непадалёку ад Беларусі.

Зямля, а гэта прыкладана 211 051 дзесяцін, пасля высялення памешчыкаў размяркавалася паміж калгасамі, саўгасамі, школамі ды іншымі дзяржаўнымі ўстановамі. Увесь сельскагаспадарчы інвентар, пабудовы і іншая маёмасць, таксама сталі ўласнасцю калгасаў ды саўгасаў.

2 ліпеня 1927 г. пастановай ЦВК БССР было вырашана лічыць кампанію па высяленню памешчыкаў скончанай і зліквідаваць цэнтральную і акруговыя камісіі да 1 ліпеня гэтага ж году. Высяленне памешчыкаў, з пункту гледжання як цэнтральных так і мясцовых уладаў, значна палепшыла сітуацыю ў тых месцах дзе яны жылі і не дало разгарнуцца «контрэвалюцыйнай барацьбе». Здаецца, на гэтым магчыма было б паставіць і кропку. Аднак, нягледзячы на тое, што камісіі былі зліквідаваны напрыканцы 20-х гадоў гэтае пытанне зноўку ўзнікла на паверсе.

*Таблица 3*

| Акруга | Усяго памешчыкаў | Выслана з БССР | Пакінута ў БССР |
|---|---|---|---|
| Віцебская | 174 | 40 | 137 |
| Барысаўская | 132 | 25 | 107 |
| Магілеўская | 98 | 31 | 67 |
| Слуцкая | 20 | 7 | 13 |
| Аршанская | 69 | 4 | 65 |
| Мазырская | 35 | 11 | 25 |
| Калінінская | 153 | 15 | 138 |
| Бабруйская | 85 | 16 | 69 |
| Мінская | 100 | 9 | 91 |
| Полацкая | 199 | 54 | 145 |
| Гомельская | 10 | 6 | 4 |
| Рэчыцкя | 20 | 11 | 9 |
| Усяго | 1096 | 229 | 867 |

У верасні 1929 г. пад грыфам «зусім сакрэтна» першы сакратар ЦК КП(б)Б Я. Гамарнік накіроўвае ў Маскву дакладную запіску, у якой адзначае, што «кампанія па высяленню былых памешчыкаў, якая была праведзена ў Беларусі ў 1925–1927 гг. не дала тых вынікаў, якія павінны былі быць».[1] Чым жа абгрунтоўвала гэтую выснову партыйнае кіраўніцтва Беларусі ? Адказ на яе дае наступнае тлумачэнне Я. Гамарніка: «У цяперашні момант рашучага наступлення на капіталістычныя элементы пры правядзенні кампаніі па самаабкладанню, зямляўпарадкаванню, калектывізацыі - узмацнілася контррэвалюцыйная актыўнасць былых памешчыкаў, якіх не выселілі ў папярэднія гады. Доказам гэтаму могуць быць наступныя факты: за 1928 г. і першую палову 1929 г. органамі ДПУ толькі па дзвух аперацыях супраць контррэвалюцыйнага элемента ў вёсцы было арыштавана 2068 чалавек, пры чым сярод іх найбольш актыўнай, арганізуючай часткай з'яўляюцца 137 былых памешчыкаў. Многія з іх асуджаны на доўгатэрміновае зняволенне і да вышэйшай меры сацыяльнай абароны за шпіянаж і іншую контррэвалюцыйную дзейнасць. Былыя памешчыкі і па цяперашні час з'яўляюцца актыўнымі арганізатарамі антысавецкай работы ў вёсцы. Пагранічнае становішча Савецкай Беларусі вклікае жаданне нашых ворагаў стварыць сабе базу на выпадак вайны ў нашым тыле і ў гэтых разліках былыя памешчыкі і іх гаспадаркі адыгрываюць найважнейшую ролю».[2] У сувязі з гэтым Я. Гамарнік прасіў ЦК УсеКП(б) дазволіць канчаткова высяліць памешчыкаў, якія яшчэ засталіся ў Беларусі. Іх высяленне павінна было скончыцца да 1 красавіка 1930 г.

Такім чынам, мэтанікіраваныя дзеянні савецкай улады ў дачыненні да польскіх памешчыкаў, і ўвогуле да памешчыкаў, у 1925-1930 гг. з'явіліся не проста акцыяй па іх "высяленню". За гэтыя пяць год была не толькі канфіскаваная іх маёмасць, разграблены дамы і маёнткі, падзелены паміж калгасамі, саўгасамі ды беднатой сельскагаспадарчы інвентар. Адбылося найгоршае – у небыццё знік своеасаблівы пласт нацыянальнага, культурнага, эканамічнага, палітычнага жыцця беларускага грамадства.

---

[1] НАРБ, ф.4, воп.21, спр.192, л.149
[2] там сама, л.150

*Літаратура і крыніцы*

1. Немаков Н. К. К вопросу о землепользовании бывщих помещиков в первое десятилетие советской власти // Вестник Московского университета. Серия 9: История. № 2. 1961.
2. НАРБ, ф. 4, оп. 3. спр. 6.
3. НАРБ, ф. 4, воп.11, спр. 53.
4. НАРБ, ф. 4, воп. 21, спр. 192.
5. НАРБ, ф. 15, воп. 4, спр. 174.
6. НАРБ, ф. 48, воп. 1, спр. 107.